В. А. Миронов сообщает: «…Большую работу отряд провел по эвакуации горючего хлеба и прочее. Эта работа была завершена полностью...» [5].

Исходя из вышеизложенного следует, что выполняя не только свои прямые обязанности, бойцы истребительных батальонов значительно влияли не только на текущее положение, но и на дальнейшее развитие событий на фронтах Великой Отечественной войны.


**БИБЛИОГРАФИЧЕСКИЙ СПИСОК**

1. Национальный архив Республики Беларусь (Далее НАРБ). Ф. 4п. Оп. 33а. Д. 1 – постановления ЦК ВКП (б), Директивы СНК СССР И ЦИК ВКП (б).
2. Пауль Карель. Восточный фронт. Книга первая. Гитлер идет на Восток. 1941–1943 гг. / Пауль Карель. – М.: Изографус, Издательство Эксмо, 2004. – 560 с.
3. Вознесенский Н. А. Избранные произведения. 1931–1947. – М.: Политиздат, 1979. – 606 с.
4. НАРБ, Ф. 4п. Оп. 33а. Д. 65 – Докладные, справки и донесения ЦК ВК(б)Б, руководящих партийных работников, НКВД, командиров отрядов и групп об организации и боевых действиях партизанских отрядов, диверсионных групп и истребительных отрядов Белоруссии.
5. НАРБ, Ф. 1450. Оп.3 Д. 181 – Копии докладных записок, информационных сообщений, оперативных сводок, донесений, сводок, донесений, справок о боевой деятельности партизанских бригад Белоруссии и истребительных батальонов города Гомеля, действующих в годы Великой Отечественной войны.
6. Биленко С. В. На охране тыла страны: истребительные батальоны и полки в Великой Отечественной войне, 1941–1945 / отв. ред. А. В. Басов. М.: Наука, 1988. – 255 с.
7. НАРБ. Ф. 4п. Оп. 33а. Д. 96 – Списки и характеристики на членов КП /б/ Б и ЛКСМБ, работников НКВД и на участников Жлобинского и Паричского истребительных батальонов, отличившихся в борьбе с немецкими фашистами.


# СТРАТЫ КАШТОЎНАСЦЕЙ НЯСВІЖСКАГА ПАЛАЦА Ў 1812 ГОДЗЕ Ў КАНТЭКСЦЕ ЕЎРАПЕЙСКАЙ КУЛЬТУРНАЙ ПРАСТОРЫ


***М. А. Дубатоўка,***
*аспірант, ДУА «Рэспубліканскі інстытут вышэйшай школы»*
*адміністратар, Нацыянальны гістарычны музей Рэспублікі Беларусь*


Тэрыторыя сучаснай Беларусі цягам шматлікіх стагоддзяў была месцам сутыкнення інтарэсаў розных дзяржаў і ваенных канфліктаў паміж імі. Вайна 1812 года не стала выключэннем. Сярод бясконцых разбурэнняў нельга не адзначыць і знішчэнне беларускай культурнай спадчыны. Яскравым прыкладам такіх працэсаў з'яўляецца рабаванне Нясвіжскага палацу, унесенага ў Спіс сусветнай спадчыны ЮНЭСКА. Магнаты рода Радзівілаў, уладары палацу, валодалі велізарнымі грашовымі сродкамі і, адпаведна, магчымасцямі запрашаць у Нясвіж працаваць замежных майстроў. Дзякуючы гэтаму культура беларускіх зямель у XVI–XVIII стст. развівалася ва ўлонні агульнаеўрапейскага кантэксту: тут былі знаёмыя ідэі Паўночнага Адраджэння, эпохі Асветы. А буйныя магнацкія рэзідэнцыі станавіліся акурат квітнеючымі культурнымі цэнтрамі. Знікненне каштоўнасцяў Нясвіжскага палацу падчас вайны 1812 года з'яўляецца стратай не толькі для Беларусі, але і для еўрапейскай культурнай спадчыны агулам.

Да вывучэння гэтай праблемы ўжо неаднойчы звярталіся беларускія і замежныя гісторыкі ў кантэксце як гісторыі сям'і Радзівілаў і Нясвіжскага палацу, так і ў рамках асэнсавання разбурэння і шкоды, што прынесла вайна 1812 года [2, 3, 6, 8, 9, 13, 17, 21, 23, 24, 25]. Да таго ж у нашым распараджэнні ёсць шэраг важных гістарычных крыніц (рэестры скарбу, мемуары непасрэдных удзельнікаў і г. д.), якія дазваляюць скласці досыць аб'ектыўную карціну падзей 1812 года ў Нясвіжскім замку [18, 19]. Аднак, на жаль, у навуковым звароце адсутнічаюць крыніцы, якія маглі б дакладна паказаць перамяшчэнні скарбаў і іх канчатковае месцазнаходжанне, што падштурхоўвае даследчыкаў працягваць пошукі.

Гісторыя Нясвіжа ў 1812 годзе наўпростава звязаная з іменем Дамініка Радзівіла. Дамінік Геранім Радзівіл (1786–1813 гг.) быў XI-ым ардынатам нясвіжскім і, як скалалася, апошнім прадстаўніком мужчынскай лініі

знакамітага роду. Апекуном Дамініка (да самай сваёй смерці ў 1790-м годзе) стаў яго дзядзька Караль Станіслаў Пане Каханку, ад якога князь у чатырохгадовым узросце ўспадкаваў велізарную латыфундыю, што ахоплівала Нясвіжскую і Алыцкую ардынацыю, а таксама гарады і вёскі [23, с. 162–163].

У 1804 годзе Дамінік прысягнуў на вернасць царскім уладам і атрымаў ва ўладанне некаторую частку маёнткаў на тэрыторыі сучасных Літвы, Украіны і Беларусі (120 тысяч душ мужчынскага полу) [12, с. 115]. Калі ўладанні Напалеона набліжаліся да межаў Расійскай імперыі, і стала зразумела, што будучага канфлікту не пазбегнуць, Дамінік Радзівіл у 1810 годзе паступае на службу створанага Напалеонам Княства Варшаўскага, а ў 1811 г. са сваім 8-м уланскім палком пераходзіць пад кіраўніцтва французскага імператара ў чыне падпалкоўніка [16, с. 100].

Чаму князь Радзівіл робіць такі крок? Адна з нагодаў заключаецца ў няўдалай палітыцы, якую праводзіў царскі ўрад на далучаных пасля падзелаў Рэчы Паспалітай тэрыторыях. Новы адміністратыўна-тэрытарыяльны падзел земляў, ажыццяўленне іншай эканамічнай палітыкі, правядзенне разбору шляхты – усё гэта аддаляла заможных магнатаў былой магутнай дзяржавы Еўропы ад расійскага цара. Яны былі адхіленыя ад удзелу ў палітыцы, што прымушала з настальгіяй згадваць часы Рэчы Паспалітай. Францыя ж выклікала сімпатыі ў тутэйшых шляхтічаў, бо дала прытулак шматлікім эмігрантам, якія пакінулі радзіму пасля падзей, звязаных з падзеламі Рэчы Паспалітай і паўстаннем 1794 г. Таксама стварэнне ў 1807 г. Княства Варшаўскага абудзіла тэндэнцыю (асабліва сярод моладзі) руху ў польскую дзяржаву, і тут Дамінік Радзівіл не стаў выключэннем [13, с. 120–121]. Не будзем таксама забывацца на абяцанні аднаўлення Напалеонам Вялікага Княства Літоўскага. Дзённым загадам Напалеона ад 1 ліпеня 1812 года быў створаны Урад ВКЛ – часовая камісія ў складзе пяці чалавек (С. Солтан, А. Сапега, Ф. Ельскі, Ю. Серакоўскі, К. Прозар). Дзейнасць камісіі распаўсюджвалася на тэрыторыю чатырох дэпартаментаў (былых губерняў): Віленскага, Гродзенскага, Мінскага, а таксама Беластоцкай вобласці [14, с. 164]. Усё ж такі гвалтоўнае далучэнне да Расійскай імперыі адбылося нядаўна і не было забыта, а шляхта лічыла сябе патрыётамі менавіта ВКЛ. Выбар князя Дамініка быў відавочна абумоўлены гэтым. Яскравым доказам такіх поглядаў князя служыць той факт, што пры заняцці Напалеонам Вільні 8-ы полк Радзівіла рухаўся ў авангардзе і ўступіў у горад першым [14, с. 159].

Дамінік стаў нашчадкам велізарных багаццяў. Згодна з рэестрам, скарбніца Радзівілаў проста ўражвае сваім начыннем. Там змяшчаліся палотны майстроў жывапісу XVI–XVIII стст., прычым існуе легенда, што Мікалай Радзівіл Сіротка запрашаў Рэмбрандта для арганізацыі карціннай галерэі палаца, і мастак нават напісаў у Нясвіжы некалькі сваіх работ [6, с. 8]. Акрамя таго, у палацы знаходзілася калекцыя рыцарскіх даспехаў з Францыі, Італіі, Іспаніі, узбраенне, збор ордэнаў і медалёў. Таксама збор каштоўнасцяў змяшчала нумізматычную калекцыю, ліставанні Радзівілаў з еўрапейскімі манархамі, гістарычныя дакументы Вялікага Княства Літоўскага і канешне знакамітая бібліятэка Радзівілаў на 20000 тамоў. Гэта не ўсё: збор змяшчаў дарагія наборы посуду з каштоўных металаў, срэбраны стол, калекцыю дыямантаў, залатыя злiткі [6, с. 9–10]. Багацці князёў Радзівілаў былі бясконца вялікія, і ў такім стане маёмасць успадкаваў князь Дамінік Радзівіл.

Рабаванні палаца пачаліся яшчэ да падзей 1812 года. Пасля падзелу Рэчы Паспалітай 1772 года частку твораў дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва з радзівілаўскай скарбніцы, зброю, залатыя і срэбраныя вырабы, каштоўныя камяні адправілі ў Пецярбург і Смаленск; частку ж разрабавалі рускія афіцэры. Па загадзе Кацярыны II некаторыя каштоўнейшыя асобнікі нясвіжскай бібліятэкі Радзівілаў перадалі Імператарскай Акадэміі навук [25 с.19–20].

Сярод каштоўнасцяў палаца даследчыкаў розных эпох заўсёды цікавілі залатыя фігуры апосталаў, якія быццам зніклі з палацу менавіта ў 1812 годзе. На вялікі жаль, звестак пра іх з'яўленне, знешні выгляд і знікненне захавалася вельмі нямнога. Існуе малаверагодная версія аб тым, што яны былі прывезеныя ў Нясвіж у XVII ст. з Канстанцінопаля Жыгімонтам-Каралем Радзівілам, сына Мікалая Кшыштафа Радзівіла [2, с. 114].

Варта сказаць аб тым, што незадоўга да ваенных падзей 1812 года Дамінік Радзівіл правёў рэвізію палацавых скарбаў, якая цягнулася са снежня 1808 года па красавік 1809 года. Магчыма, рэвізія праводзілася з мэтай азнаямлення князя з каштоўнасцямі і праверкі іх наяўнасці. Сярод занатаваных рэчаў інтарэс для даследвання прадстаўляе «Цыборыюм Святога Міхала». Цыборыюм – ківор (у праваслаўнай традыцыі), а ў гэтым выпадку пабудова для ахвярванняў над алтаром ці сам алтар. У дакуменце згадваецца, што для цыборыюма меліся срэбныя дзверцы і «фігуры для дэкарацыі тых жа дзвярэй належныя срэбныя

пазалочаныя, а менавіта Хрыстос са Святым Янам, на плячы яго заснулым, у палову фігуры. Частка шаты таго ж Святога Яна, два апосталы, што сядзяць у поўных фігурках у шатах пазалочаных, два апосталы па грудзі з шатамі пазалочанымі, тры галавы апосталаў з часткай шаты пазалочанай і галоўка срэбная Юды – усяго адзінаццаць штук» [17, с. 234]. Чаму апосталаў не дванаццаць? Аб гэтым пойдзе гаворка далей. Галоўным застаецца тое, што на момант пачатку XIX стагоддзя фігуры апосталаў разам з іншымі багаццямі знаходзіліся ў палацы і былі апісаныя пры правядзенні рэвізіі за чатыры гады да пачатку руска-французскай кампаніі.

Сведчанні пра апосталаў можна сустрэць і ва ўспамінах людзей, якім пашчасціла зірнуць на багатую скарбніцу Радзівілаў. Вядома, што апошні кароль Рэчы Паспалітай Станіслаў Панятоўскі заязджаў у Нясвіж да Караля Радзівіла. Пазней рускі князь М. Рапнін, што суправаджаў Панятоўскага на сойме ў Гародні, пісаў Кацярыне II такія словы: «Кароль заехаў да К. С. Радзівіла ў Нясвіж. Пасля бліскучага фейерверка і абеда на 300 асобаў кароль спусціўся ў сутарэнні замка і пабачыў злiткі залота, складзеныя да звода падзямелля. Золата было сотні пудоў, мноства старажытных залатых рэчаў і дванаццаць апосталаў з гэтага метала і срэбра, аздобленыя каштоўнымі камянямі» [3, с. 16]. У 1868 годзе ў Варшаве выйшлі ў свет мемуары Міхала Казіміра Агінскага, дзе ён згадвае фігуры апосталаў: «Гэтыя статуі яны вазілі з сабою. Калі прагуляюць дзе ці хочуць прыдбаць новыя маёнткі, то закладваюць аднога з дванаццаці апосталаў, але заўсёды выкупляюць яго назад» [2, с. 112]. І тут можна паразважаць над тым, чаму апосталаў ў рэестры Дамініка Радзівіла згадваецца адзінаццаць. У крыніцах захаваліся звесткі, што Пане Каханку вазіў з сабой апосталаў і перыядычна мог з нагоды патрэбы грошай закласці Святога Мацея ці Луку, і наўрад ці ён не выкупаў фігуру назад. Верагодна, адна фігура апостала, што троху пашкодзілася, была пераплаўленая на срэбра: у крыніцах можна адшукаць падобны загад Дамініка Радзівіла ад 17 лютага 1809 года [17, с. 235].

Выдадзеныя ў Парыжы ў 1869 годзе ўспаміны Адама Чартарыйскага даюць такія звесткі: «Багаты замак у Нясвіжы. У 18 залах адных толькі ўпрыгожванняў сабрана на 5–10 мільёнаў дукатаў. Каштоўнейшыя калекцыі зброі, карцін, кніг, брыльянтаў. Але няма нічога даражэй за калекцыю «Дванаццаць апосталаў». Пяць з іх чыстага золата і ўсыпаныя каштоўнымі камянямі. Кошт іх роўны кошту золата, выдаткаванага імператарам Напалеонам на Егіпецкі паход» [2, с. 112].

Паэт і даследчык Уладзіслаў Сыракомля, што паспеў павандраваць па Беларусі і скласці некаторыя краязнаўчыя нарысы, таксама цікавіўся радзівілаўскімі скарбамі. Ён піша пра прыдворнага нясвіжскага паэта Юзэфа Ляснёўскага, які казаў так: «Дванаццаць апосталаў і чатыры евангелісты велічынёй у два локці – гэта злата ў радзівілаўскай скарбніцы: сапраўды, гэтых апосталаў і евангелістаў можна назваць дамашнімі бажкамі, бо яны не павінны дапусціць ніякіх няшчасцяў у доме Радзівілаў...» [18, с. 278–279]. Ляснеўскі таксама кажа пра нібыта вялікі круглы срэбны стол у палацы на дванаццаць асобаў, ля якога збіраліся апосталы з евангелістамі, давалі парады на шчаслівую будучыню рода Радзівілаў і іх уладанняў. Няцяжка заўважыць, што чарговы раз тагачаснікі падкрэсліваюць незлічоныя багацці Нясвіжа. Цікава зазначыць, што апісаныя ў Сыракомлі чатыры евангелісты ў рэестры князя Радзівіла не ўзгадваюцца [17, с. 235].

Баявыя дзеянні ў 1812 годзе распачаліся на тэрыторыі сучаснай Беларусі. Князь Дамінік Радзівіл далучаецца да Вялікай арміі і рушыць з Напалеонам на Маскву. Ён браў удзел у баях пад Смаленскам, Мажайскам, Воранавам. Калі французскі імператар з рэшткамі войску пачынае адступаць назад, Радзівіл рушыць з ім [16, с. 100]. Тут разгортваюцца падзеі, якія выклікаюць спрэчкі па сёння. Армія Напалеона везла з сабою на захад нарабаваныя скарбы з Масквы (музейныя рэліквіі, царкоўнае начынне, карціны). Рабавалі каштоўнасці французы, а пасля іх перакупіў князь Радзівіл [3, с. 18]. Па дарозе на захад Дамінік заязджае ў свой палац у Нясвіжы. Там ён дае загад эканому Адаму схаваць частку скарбаў у спецыяльнае патаемнае месца, пра якое ведалі толькі князь і эканом, а астатнія абозы з каштоўнасцямі адправіць за ім, бо Дамінік бег у бок Вільны.

Аднак эканом не паспеў выканаць загад свайго гаспадара: у Нясвіж уступаюць войскі адмірала Чычагава [2, с. 50]. Рускія войскі пачынаюць вопіс каштоўнасцяў палацу. І тут нечакана некалькі казацкіх раз'ездаў недалёка ад Міра затрымалі ганца, які імкнуўся даставіць князю Радзівілу такое пасланне: «Верны слуга Адам схаваў у надзейным месцы дванаццаць каштоўных апосталаў, кухоннае серабро, карціны, а таксама частку рэчаў, вывезеных з Масквы». Верагодна, Адам наўмысна ахвярваў ганцом, каб адвесці вочы рускіх войскаў,

выйграць час і даць усё ж такі абозу выехаць услед за князем. Сам эканом ані ў чым не прызнаўся і быў пакараны [13, с. 113–114].

Дзеля таго, каб паспрабаваць прасачыць лёс незлічоных каштоўнасцяў замку ў 1812 годзе, неабходна звярнуцца да ўспамінаў непасрэдных удзельнікаў падзей. Такіх карысных звестак да сённяшняга дня дайшло няшмат. І тут спадручна ўзгадаць ліст адмірала Паўла Васільевіча Чычагава да імператара Аляксандра І. Чычагаў узначальваў малдаўскі корпус расійскай арміі, што ўвайшла ў Нясвіж у лістападзе 1812 года. Адмірал пісаў імператару наступнае: «В Несвиже я узнал, что кн. Доминик Радзивилл, который сформировал полк для Наполеона, позволил себе всякого рода косвенные клеветы, что он отправил некоторые ценные вещи, которые должны были служить доказательством разграбления, совершённого ими в Москве. Чтобы несколько отомстить, я позволил порыться в некоторых погребах его дома: там нашли сокровища: жемчуг, бриллианты и пр. Я увёз что мог, это будет сложено в Бобруйске, дабы Ваше Величество изволили решить, что с этим делать. Я ничего не видел, но говорят, что есть вещи, достойные музеев. Всё ценят более миллиона рублей» [19, с. 50]. Далей, па загадзе Чычагава, скарбы на трынаццаці брычках былі вывезеныя ў Мінск, а пасля ў Маскву, Харкаў, Пецярбург [2, с. 116].

Калі руская армія восенню заняла Нясвіж, камандзір 14-га егерскага палка А. І. Красоўскі так напісаў у сваім данясенні пра маёмасць, скрадзеную з Масквы: «Неприятель не ждал атаки и очистил город, в котором обнаружено больше чем на миллион драгоценностей, бриллиантов и жемчугов, награбленных в Москве и привезённых в Несвиж на сохранение» [3, с. 19].

Пад камандаваннем адмірала Чычагава знаходзіўся военачальнік рускай арміі Сяргей Алексеевіч Тучкоў, які непасрэдна па загадзе адмірала, як сведчаць крыніцы, рабаваў скарбы Нясвіжскага палаца. За гэта Адам Чартарыйскі прад'явіў яму абвіненне, інкрымінаваўшы Тучкову таксама прысваенне 10 мільёнаў злотых ва ўласную кішэню. Аднак падчас следства высветлілася, што ўсе вынятыя ў Радзівілаў рэчы і грошы былі падрабязна складзеныя ў вопіс і перададзены Чычагавым у вышэйшыя чыны імператарскай арміі, што знімала з Тучкова абвінавачванні. Тучкоў знаходзіўся пад следствам аж да 1826 года, пакуль яго не апраўдалі за недоказам віны [15, с. 729].

Крыніцы таксама згадваюць спадара Альберта Бургельскага, які, хутчэй за ўсё, быў дазорцам палаца. Палкоўнік Кнорынг, пачуўшы пра скарбы Радзівілаў, завітаў у палац і пасадзіў Бургельскага за краты. Пазней сам Тучкоў яшчэ раз арыштоўваў Бургельскага і, пэўна, дабіўся карыснай мэты. Пад кантролем Альберта Бургельскага з палацу былі вывезеныя калекцыі карцін, фарфора, сталовага срэбра, халоднай зброі, а таксама дакументы славутага архіва Радзівілаў. Агульны кошт вывезенага, як было азначана вышэй, сапраўды склаў каля 10 мільёнаў польскіх злотых [4, с. 39].

Бургельскі пражыў яшчэ 13 гадоў. Паводле яго рапарту і была распачатая безвыніковая крымінальная справа над Тучковым [17, с. 236–237].

Што да лёсу архіва роду Радзівілаў у Нясвіжы, час вайны 1812 года застаўся ў цені ўвагі даследчыкаў [9, с. 103]. Нясвіжскі архіў пры ардынаце Дамініку Радзівілу знаходзіўся не ў лепшым стане. Гэта тлумачылася частымі зменамі прадстаўнікоў князя, якія гэтак жа часта змянялі архіўных службоўцаў. Таксама царскі ўрад перш-наперш ставіў перад сабой задачу захаваць архівы буйных гарадоў-цэнтраў губерняў, якія захоўвалі важныя стратэгічныя крыніцы аб мясцовасці. Дакументы, што захоўваліся ў дробных гарадах, уратаваныя не былі. Часткова архіў Нясвіжскага замка быў вывезены ў Няборава [22, с. 48], часткова знішчаны акурат на месцы [1, с. 63]. Захаваліся пазнейшыя сведчанні архіварыюсаў Рамуальда Сымановіча і Ануфрыя Ёдкі аб тым, што безліч актаў і папер з архіва падчас вайны 1812 года былі раскіданыя па дзядзінцы і замкавых валах, а ў саміх памяшканнях хадзілі наўпрост па дакументах, якіх было насыпана да пояса [9, с. 51–52]. Салдаты дазвалялі сабе рэзаць пергамент і выкарыстоўваць для рамонту падцяжак. Апрача таго, дакументы архіву замянялі дровы для абагрэву палаца [7, с. 62], а «… другие документы исторической важности похищены разными лицами. Печати, не только украшенные алмазами, но и медные, какие только были и имели приятную наружность, тогда от документов оторваны» [21, с. 160].

Што да астатніх скарбаў палацу Радзівілаў, даследчыкі, якія займаліся непасрэдна гісторыяй каштоўнасцяў Нясвіжа [13, 17, 24, 25], усё ж такі прытрымліваюцца меркавання, што рускія афіцэры, якія ўзялі Нясвіж у канцы 1812 года, адправілі частку каштоўнасцяў у цэнтральныя губерні Расійскай Імперыі, а частку

захавалі ва ўласнае выкарыстанне. Магчыма, гэтая версія максімальна набліжаная да праўды, бо мае дакументальныя пацвярджэнні, прыведзеныя вышэй. Таксама некаторыя рэчы (дакументы архіва) знішчаліся адразу на месцы.

Такім чынам, скарбы палацу ў Нясвіжы з'яўляюцца агульнаеўрапейскімі культурнымі здабыткамі. Знішчаныя каштоўнасці назад вярнуць немагчыма. Аднак некаторыя рэчы проста змянілі сваё месцазнаходжанне па розных суб'ектыўных прычынах, якія сёння не адыгрываюць аніякай ролі. Гэты факт дае даследчыкам нагоду працягваць пошукі зніклых каштоўнасцяў. Узбагачэнне беларускіх аб'ектаў гісторыка-культурнай спадчыны творамі выяўленчага, дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва павышае айчынны культурны патэнцыял, робіць краіну прывабнай для замежных даследчыкаў, турыстаў, а таксама нагадвае сучаснаму пакаленню пра важнасць захавання мінулага ў сённяшнім дні. Гэта неад'емная частка калектыўнай гістарычнай памяці еўрапейскай прасторы.

**БІБЛІЯГРАФІЧНЫ СПІС**


1. Антонава Т. Ці стане Нясвіж турыстычнай Мекай? // Беларуская мінуўшчына. – 1995. – № 1. – С. 63–67.
2. Асіноўскі С. М. Загадка дванаццаці апосталаў Нясвіжскага замка / С. М. Асіноўскі // Архівы і справаводства. – 2006. – № 2. – С.107–119.
3. Бакуменко М. Н. Сокровища в огне войны. – Мн.: Беларусь, 1990 г. – 232 с.
4. Веремейчик А. Е. Несвижский замок в судьбе трёх российских военачальников / А. Е. Веремейчик // Воен.-ист.журн. – 2009. – № 10. – С. 38–41.
5. Калубовіч А. Мова ў гісторыі беларускага пісьменства. Ч. 1. Мюнхэн – Лёндан, 1974–1975. – 84 с.
6. Кламин, Я. История Радзивилловских сокровищ (The history of the Radzivills treasures) : исторический очерк / Ян Кламин ; [перевод В. Куницкого]. – Несвиж : Слуцкая укрупненная типография, 2002. – 20 с.
7. Клепікаў М. Я. Румянцаўскі гурток і ахова помнікаў гісторыі і культуры Беларусі // Беларускі гістарычны часопіс. – 2003. – №1. – С. 60–66.
8. Латушкін А. М. Дакументальныя страты Нясвіжскага архіва Радзівілаў у другой палове XVIII – першай палове XX сагоддзяў / А. М. Латушкін // Архівы і справаводства. – 2007. – №2. – С. 102–107.
9. Латушкін, А. М. Да гісторыі Нясвіжскага архіва князёў Радзівілаў у 1790–1818 гг. / А.М. Латушкін // Беларускі археаграфічны штогоднік. – 2005. – № 6. – С. 46–60.
10 . Лукашэвіч А. М. 1812 год і Беларусь / А. М. Лукашэвіч // Беларуская думка. – 2002. – №2. – С. 119–124.
11. Мальдис, А. И. Белорусские сокровища за рубежом. / А. И. Мальдис. – Минск :Літаратура і мастацтва, 2009. – 208 с.
12. Метельский А. А. Владельцы старого Несвижа. – Мн: Беларуская Энцыклапедыя імя П. Броўкі, 2011. – 160 с.
13. Ненадавец А. М. Дзе яны, скарбы рода Радзівілаў? / А. М. Ненадавец // Беларуская думка. – 2007. – №8. – С. 109–115.
14. Несцярчук Л. М. Беларусь у вайне 1812 года. Паміж Напалеонам і Аляксандрам / Л. М. Несцярчук. – Брэст : ТАА «Паліграфіка», 2012 г. – 320 с.
15. Отечественная война 1812 года. Энциклопедия. – М.: «Российская политическая энциклопедия» (РОССПЭН), 2004. – 880 с.
16. Памяць: Гіст.-дакум. хроніка Нясвіжскага раёна / Рэд.кал.: Г. П. Пашкоў (гал. рэд.) і інш.; Маст. Э. Э. Жакевіч. – Мн. : БелЭн, 2001. – 632 с.
17. Рыбчонак С. А. Дванаццаць апосталаў / С. А. Рыбчонак // Вяртанне-3: Зборнік артыкулаў і дакументаў. – Беларус. фонд культуры. – Мн., 1996. – С. 232–237.
18. Сыракомля У. Добрыя весці: Паэзія, проза, крытыка. – Мн.: Маст. літ., 1993. – 526 с.
19. Чичагов П. В. Письма адмирала Чичагова к Александру I / Сообщ. М. И. Богдановичем. – СПб., 1831. – 218 с.
20. Шишигина-Потоцкая К. Я. Легенды Несвижа: Ист.-краевед. очерк / К. Я. Шишигина-Потоцкая. – 2-е изд. – Барановичи: Баранов. укрупн. тип., 2003. – 72 с.
21. Шумейко М. Ф. Война 1812 года и белорусские архивы / М. Ф. Шумейко // Французская рэвалюцыя і лёсы свету: Матэрыялы Міжнар. навук.-практ. канф., прысвеч. гадавіне Фр. рэвалюцыі (1789-1799 гг.), 21–22 крас. 1999 г., Мінск / Рэдкал: У.С.Кошалеў (адк. рэд.) і інш. – Мн.: БДУ. – 1999. – С. 159–160.
22. Шумейко М. Ф., Козак К. И., Селеменев В. Д. Архивоведение Беларуси. Учебное пособие для студентов исторических факультетов вузов в двух частях. Часть 1. – Мн.:Издательский центр РИВШ. – 1997. – 101 с.
23. Шышыгіна-Патоцкая К. Я. Нясвіж і Радзівілы / К. Я. Шышыгіна-Патоцкая. – Мн.: Полымя, 2001. – 240 с.
24. Шышыгіна-Патоцкая К. Я. Скарбы Нясвіжа. – Мн.: Полымя, 1993. – 192 с.

25. Яніцкая М. М. Драматычныя лёсы каштоўнасцей Нясвіжскага замка / М. М. Яніцкая // Вяртанне-2: Артыкулы, дакументы і архіўныя матэрыялы па праблемах пошуку і вяртання нацыянальных каштоўнасцей, якія знаходзяцца за межамі Рэспублікі Беларусь. – Беларус.фонд культуры. – Мн., 1994. – С. 19–27.

# СПРОБЫ АДНАЎЛЕННЯ КАРПАРАТЫЎНАЙ АРГАНІЗАЦЫІ ДВАРАНСТВА Ў БЕЛАРУСІ

***А. П. Жытко,***
*доктар гістарычных навук,*
*прафесар кафедры гісторыі Беларусі*
*і славянскіх народаў БДПУ;*
***С. А. Талмачова,***
*кандыдатр гістарычных навук,дацэнт,*
*загадчык кафедры гісторыі Беларусі*
*і славянскіх народаў БДПУ*

Навуковае высвятленне адносін царскай улады да дваранскай карпаратыўнай арганізацыі ў Беларусі знаходзіцца ў рэчышчы агульнай праблемы, якая звязана з вызначэннем месца і ролі дваранства ў краіне на яе капіталістычнай стадыі развіцця. Гэтыя адносіны мелі адкрыта абмежавальны і дыскрымінацыйны характар, таму ў задачу даследчыка ўваходзіла перш за ўсё раскрыццё іх матывацыі. Сапраўды, калі саслоўе, якое заўсёды лічылася прыхільнікам расійскага самадзяржаўя, аказваецца яго галоўным ворагам, дык тлумачыць гэта толькі нацыяналістычнымі памкненнямі не выпадае. Тут больш правамерна ставіць пытанне аб ролі дваранства ў культурна-нацыянальным адраджэнні Беларусі, яго супрацьдзеянні русіфікатарскай палітыцы самадзяржаў'я.

З улікам усяго гэтага ў артыкуле аналізуецца як мэта, якую праследаваў царызм пры стварэнні дваранскай карпаратыўнай арганізацыі, так і яе структура, функцыі і роля ў сістэме ўнутрысаслоўнага жыцця і мясцовага кіравання.

Карпаратыўная арганізацыя расійскага дваранства заканадаўча была аформлена «Даравальнай граматай дваранству» 1785 г., па якой вышэйшае саслоўе атрымала пэўнае самакіраванне, усю павятовую і некаторую частку губернскай улады. Заканадаўства па гэтых пытаннях з некаторымі зменамі захавалася да 1917 г. Пасля далучэння беларускіх зямель да імперыі саслоўнае самакіраванне распаўсюджвалася і на набілітэт Беларусі.

Разам з тым, неабходна мець на ўвазе, што шляхта мела сваю карпарацыю і ў Рэчы Паспалітай з больш шырокімі правамі, чым расійскае дваранства. Саслоўнае самакіраванне ў Рэчы Паспалітай было трохузроўневае – павет, ваяводства і вальны сейм. Апошні з'яўляўся вышэйшым заканадаўчым органам у дзяржаве, які прымаў важнейшыя рашэнні ў правядзенні знешняй палітыкі, а з канца XVI ст – атрымаў права выбару караля.

Даравальная грамата прадугледжвала пагубернскую арганізацыю вышэйшага саслоўя. Вышэйшымі распарадчымі органамі таварыстваў з'яўляліся губернскія і павятовыя сходы. Павятовыя сходы звычайна займаліся падрыхтоўкай да губернскіх: праверкай спісаў дваран павета, высвятленнем іх выбарчых правоў, папярэднім абмеркаваннем асобных пытанняў і г. д. Усе вышэйшыя карпаратыўныя справы вырашаліся на губернскіх сходах. На іх заслухоўваліся справаздачы аб выкананні прынятых раней пастаноў, зацвярджаліся зборы на прыватныя дваранскія патрэбы, выбіраліся ўсе службовыя асобы карпаратыўных органаў: губернскія і павятовыя прадвадзіцелі, дэпутаты і сакратары дваранскіх дэпутацкіх сходаў, засядацелі дваранскіх апек, кандыдаты для замяшчэння шэрагу каронных пасад па мясцовым кіраванні і суда [1, ст. 167]. Ім належала права – і гэта лічылася адной з важнейшых прывілей – падаваць праз губернскіх прадвадзіцелей ці дэпутатаў прашэнні ці скаргі губернскаму начальству, міністрам і непасрэдна імператару.